


# З дзяцінства нам вядома родная мова

Літаратурны марафон «З табой маё слова, Радзіма» адбыўся напярэдадні Міжнароднага дня роднай мовы ў Магілёўскай абласной бібліятэцы імя У.І. Леніна





**У мерапрыемстве, прысвечаным Году беларускай жанчыны, гераічнай абароне г. Магілёва ў гады Вялікай Айчыннай вайны, юбілеям беларускіх пісьменнікаў, прынялі ўдзел вядомыя магілёўскія пісьменнікі і паэты, члены Саюза пісьменнікаў Беларусі, прадстаўнікі грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд міру», таварыства «Веды», навуковая інтэлігенцыя, навучэнцы вышэйшых і сярэдніх устаноў адукацыі горада, а таксама госці і чытачы бібліятэкі.**

У рамках марафону студэнты Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова, навучэнцы сярэдніх школ №2 і №15 г. Магілёва змаглі прачытаць вершы сваіх любімых аўтараў.

Перад прысутнымі выступілі з вершамі члены Саюза пісьменнікаў Беларусі: Алесь Казека, Віктар Кунцэвіч, Леанід Іскроў, Алена Беланожка, Святлана Цмугунова.

Да марафону далучыліся члены літаратурнага аб'яднання «Ветэран» пры Магілёўскім гарадскім савеце ветэранаў, якія павіншавалі ўсіх са святам роднай мовы і прачыталі аўтарскія вершы.

– Гэтым мерапрыемствам напярэдадні Міжнароднага дня роднай мовы мы адкрылі падрыхтоўку да Дня беларускага пісьменства, які сёлета пройдзе ў горадзе Касцюковічы, – адзначыў старшыня Магілёўскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» **Алесь Казека**.

Сустрэча стала першай часткай цыклу мерапрыемстваў «Мова! Ты свецішся словам кожным», якія праходзілі ва ўстанове культуры на працягу тыдня: у бібліятэцы дзейнічалі кніжныя выставы, літаратурныя і інфармацыйныя гадзіны, моўныя гульні і квэсты.

– Каб ведаць сваю родную мову, не забываць яе, трэба чытаць творы беларускіх аўтараў, – лічаць навучэнцы 5 класа сярэдняй школы №15 г. Магілёва **Міхаіл Караленка** і **Раман Слізні**.

Мерапрыемства яшчэ раз даказала, наколькі лірычна і прыгожа гучыць наша беларуская мова.

